**Источник: «Звязда» - 2012-04-17**

## Адкрыццё дзіцячага хірурга

*Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ*

**Мяне заўсёды цікавілі людзі навукі — тыя, хто з галавой умее акунуцца ў сваю справу і не звяртаць увагу ні на недахоп часу, ні на жыццёвыя спакусы. Яны працаголікі і энтузіясты адначасова. Гэта тыя людзі, за плячыма якіх ляжаць адкрыцці айчыннай навукі, а іх галовы — скарбніца ведаў. Аднак што іх матывуе, кім яны з'яўляюцца ў прыватным жыцці і дзе шукаюць ключы да вялікіх дасягненняў?**



Па адказы на гэтыя пытанні я звярнулася да маладога вучонага, які ўжо паспеў зрабіць імя ў навуцы і сабраць вакол сябе маладых даследчыкаў краін СНД. Уладзімір Казбанаў — дзіцячы хірург, аспірант Інстытута фізіялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь. Ён жа з'яўляецца каардынатарам і ініцыятарам адразу трох праектаў, якія праходзяць на гэтым тыдні: міжнароднай канферэнцыі "Моладзь у навуцы — 2012", міжнароднага форуму студэнтаў і навучэнцаў "Першы крок у навуку — 2012", і ў межах гэтых дзвюх падзей асобнага праекта "INMAX-12".

Навуковец на ўсё знаходзіць час і яшчэ паспявае сустрэцца з журналістамі, якія не абдзяляюць увагай яго персону. Пагутарыўшы з гэтым маладым чалавекам, я зразумела, што ў аснове яго асобы — настойлівасць у дасягненні мэты, аптымістычнае стаўленне да жыцця і вялікая любоў да людзей, да дзяцей у прыватнасці.

Казбанаў расказаў карэспандэнту "Звязды" пра свае навуковыя распрацоўкі, практычныя дасягненні і жыццёвыя прыярытэты:

**— Уладзімір, вы з'яўляецеся тройчы лаўрэатам прэміі Спецыяльнага фонда Прэзідэнта Беларусі па сацыяльнай падтрымцы таленавітай моладзі, двойчы адзначаны падзякай старшыні прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук...**

— Усе гэтыя дасягненні — заслугі ў першую чаргу не мае, а маіх выкладчыкаў — тых людзей, якія некалі падтрымалі імкненне займацца навукай, граматна выбудавалі план маіх даследаванняў і на этапе выканання заўсёды дапамагалі, інтэрпрытавалі тыя вынікі, якія я атрымліваў.

Што з'яўляецца асноўным у маіх даследаваннях? На другім курсе медыцынскага ўніверсітэта я пайшоў у гурток дзіцячай хірургіі, і мой навуковы кіраўнік Юрый Дзягцяроў прывёў мяне ў Інстытут фізіялогіі НАН, дзе я ўпершыню ў жыцці ўзяў у рукі скальпель, трымальнік і ў лабараторных умовах ажыццявіў сваю першую аперацыю на лабараторных жывёлах. За гэтым паследаваў шэраг разнастайных эксперыментаў. Сярод іх найбольш значнымі для мяне з'яўляліся даследаванні сумяшчальнасці тытанавых імплантантаў з алмазападобнымі пакрыццямі — за гэтыя распрацоўкі я і атрымаў узнагароды.

Часам нам здаецца, што пэўныя прэміі і перамогі ў жыцці — гэта нешта недасяжнае і ў гэтым кірунку нават не трэба працаваць, што гэта ўсё за аблокамі. Гэта не так: існуе штогадовы конкурс навуковых прац пры Міністэрстве адукацыі, куды кожны студэнт можа адпраўляць свае работы. Па гэтаму шляху я і пайшоў, пачынаючы з другога курса, і паступова стаў атрымліваць нейкія адзнакі, а пасля і атрымаў званне лаўрэата.

***— Распрацаваны вамі від імплантантаў зараз выкарыстоўваецца ў айчыннай медыцыне?***

— Справа ў тым, што найбольш распаўсюджаныя зараз імплантанты зроблены з тытану. Метал — гэта найлепшы матэрыял па фізічных і біялагічных паказчыках. Але любы чужародны агент наш арганізм успрымае агрэсіўна, з той або іншай выяўленасцю. Калі гэты канфлікт дастаткова высокі, аперацыі, якія праводзяцца з выкарыстаннем імплантантаў, прыносяць не карысць, а шкоду, бо пачынаюцца загнаенні, інфекцыі. Медыцына ва ўсім свеце на сённяшні дзень шукае новыя матэрыялы, якія былі б біялагічна сумяшчальнымі, на якія арганізм рэагаваў бы мякка.

Адну з такіх новых тэхналогій пачалі выкарыстоўваць у нас у краіне, — гэта алмазападобныя пакрыцці на тытанавых імплантантах. Даследаваць іх якасці пачалі не ў медыцыне, а ў фізіка-тэхнічным інстытуце НАН. Гэтыя пакрыцці на 60-70% набліжаюцца да шчыльнасці алмаза, хоць уяўляюць сабой вельмі тонкія плёнкі. Пасля ў іх сталі дадаваць яшчэ і наначасціцы серабра, якія надалі ім новыя ўласцівасці, дастаткова цікавыя. Мы ж сталі даследаваць іх медыцынскія якасці, праводзячы эксперыменты на жывёлах і на культуры клетак. Сёння мы бачым, што такія імплантанты больш сумяшчальныя з арганізмам, ён успрымае іх нашмат лепш. Гэтае пакрыццё стала набліжаным да ідэальнага: мы спадзяёмся, што ў будучыні аперацыі па замене імплантанта на новы трэба будзе праводзіць вельмі рэдка або ўвогуле стане дастаткова аднаразовай устаноўкі пратэза.

***— Чаму вы вырашылі лячыць менавіта дзяцей?***

— Я заўсёды лёгка знаходзіў з імі агульную мову — і ў мяне гэта выклікала вельмі яскравыя адчуванні. Таму, калі я паступаў у медыцынскі ўніверсітэт, то адразу выбраў педыятрычны факультэт. Некаторыя эпізоды маёй урачэбнай дзейнасці пацвярджаюць, што выбар правільны: з практыкі ў медыцынскім універсітэце я вяртаўся не толькі з дзённікам запісаў загадчыка аддзялення, але і са стосам дзіцячых малюнкаў з вершамі, прысвечанымі "Доктару Уладзіміру Уладзіміравічу" або "Дзядзьку Вову" — як яны пісалі. Тады я зразумеў, што падыход да дзяцей, відаць, правільны знайшоў.

Зараз я займаюся навукай, але ўпэўнены, што пасля заканчэння аспірантуры абавязкова вярнуся ў медыцыну — такая настальгія часам бывае. Я працаваў таксама ўрачом хуткай дапамогі, і менавіта там, пасля змены, нягледзячы на стомленасць, я адчуваў найвялікшае ўнутранае задавальненне і разуменне, што прыношу карысць.

***— Калі не медыкам, то кім бы вы былі?***

— Настаўнікам. Мне здаецца, кожны чалавек унутры сябе ведае, што важна і трэба рабіць зараз і што ён хацеў бы рабіць. Часам мне вельмі хочацца зацішша — тады б я быў проста ў раі: мець зносіны з дзецьмі, няхай гэта настаўніцкая або медыцынская дзейнасць, перадаваць ім свой пазітыў, сваю радасць і, адпаведна, у іх усмешках атрымліваць свой настрой — свой заробак.

Яшчэ я мог бы займацца дабрачыннай дзейнасцю, і не толькі як удзельнік, але як арганізатар працэсу. Таму што сёння вельмі шмат дзяцей — як у дамах-інтэрнатах, так і ў звычайных сем'ях — якім неабходны клопат і любоў, што даюць надзею і радасць. На жаль, у працэсе маёй урачэбнай практыкі ў мяне складваецца такое ўражанне, што многія дзеці

становяцца або азлобленымі, або аддаленымі ад свету і інтарэсы маюць далёка не высокамаральныя. Іх бацькі кажуць, што вельмі складана выхоўваць, падкрэслю, сапраўднага чалавека. Прасцей забяспечыць яго матэрыяльна — даць малому грошай, каб яно адчапілася або каб пахвалілася перад аднакласнікамі, суседзямі. Нашмат больш складана сядзець з дзіцем і рабіць урокі, нешта тлумачыць...

***— На сённяшні дзень вы ўжо шмат дасягнулі, як у навуцы, так і ў практычнай дзейнасці. Якія якасці ў сабе трэба развіваць, каб быць паспяховым і шмат чаго дабіцца?***

— У першую чаргу трэба вызначыць сваю галоўную мэту ў жыцці і фармуляваць яе, сыходзячы са сваіх інтарэсаў, з таго, што добра атрымліваецца. Важна запасціся вялізнай цярплівасцю. Чалавеку, які пачынае нечым вылучацца, заўсёды будзе вельмі складана, ён пастаянна будзе спатыкацца аб камень неразумення, непрымання. Ні ў якім разе нельга кідаць справу, калі штосьці не атрымліваецца або нехта пачынае ўстаўляць палкі ў колы. Тут ёсць адзін важны памочнік: калі мы робім штосьці толькі дзеля сябе, то ў нас ёсць матывацыя, але не надта моцная; самы вялікі стымул — гэта разуменне, што ты робіш штосьці для іншых і пры гэтым адчуваеш адказнасць перад імі — тут ты ўжо не праспіш, не зможаш нешта недарабіць. І яшчэ — ніколі не аддзяляйце свае інтарэсы ад інтарэсаў дзяржавы — яны заўсёды павінны быць разам.